

ПРЭЗІДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў КАЗАХСТАНЕ



КУРС НА МАДЭРНІЗАЦЫЮ


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 ЧЭРВЕНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 107 (28974)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БРЫЛА, намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«У час апошніх сустрэч мы знаходзім з расіянамі агульную мову. З аднаго боку, нейкая крыўда дзесьці ў душы можа і хавацца. З другога боку, ты разумееш, што адносіны з Рассельгаснаглядам дысцыплінавалі нас вельмі сур'ёзна. Цяпер мы, можа быць, нават празмерна падыходзім да лабараторнага кантролю, якасці нашай прадукцыі. Гэта значыць, яны нас трошкі сабралі ў кулак. Цяпер ідзе паміж краінамі нядрэнны дыялог, спакойны, канструктыўны. У найбліжэйшы час плануецца візіт нашага міністра да міністра сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі. Вядома, будзем працягваць далей дыялог з нагоды адкрыцця нашых прадпрыемстваў».*

# ЦЕРАЗ ДЗВІНУ... НА ТРАКТАРЫ



Жыхар вёскі Шарагі Мёрскага раёна Віктар БРЫГАС часта ездзіць на іншы бераг Дзвіны — у Верхнядзвінскі раён. Спачатку — тры кіламетры да горада Дзісны (на маленькім трактарчыку з плугамі альбо акучвальнікамі), потым — на пароме, а далей, да вёскі Нурава, — яшчэ два кіламетры.

— Трэба дапамагаць родным і сваякам, таму я кожны дзень на сваім памочніку — міні-трактары, — расказаў Віктар, пакуль паром стаяў на часовым прыколе і сказаў добрыя словы ў адрас дарожных работнікаў гэтага парома, якія бездакорна нясуць службу і трымаюць рачное судна ў парадку.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Касым-Жамарта Такаева з перамогай на прэзідэнцкіх выбарах у Казахстане.**
- З-за спёкі ў Беларусі 11—12 чэрвеня аб'яўлены аранжавы ўзровень небяспекі.
- **Інфляцыя ў маі склала 0,3 %.**
- У Беларусі ў маі сярод прадуктаў харчавання больш за ўсё патаннелі агуркі (на 38,28 %) і памідоры (на 31,95 %), а падаражэлі — рэпчатая цыбуля (на 41,23 %) і морква (на 35,45 %).



- **Колькасць самазанятых у Віцебскай вобласці ў студзені — маі вырасла на 37 %.**

Напярэдадні

# АДБІТКІ, ПАХ І ПАНАРАМНАЯ КАМЕРА

### Як судэксперты рыхтуюцца да гульняў?

**Судовыя эксперты таксама рыхтуюцца да ІІ Еўрапейскіх гульняў. Перад спартыўным форумам яны атрымалі найноўшае абсталяванне, якое дазволіць аператыўна агледзець месцы здарэнняў і рабіць тэрміновыя экспертныя даследаванні. Дэманстрацыя здабыткаў адбылася ў Мінскім гарадскім упраўленні Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз (ДКСЭ) . Падрыхтаванасць экспертаў да Гульняў праверыў асабіста старшыня ведамства Андрэй Швед.**

— Падрыхтоўка да работы падчас маштабных спартыўных спаборніцтваў была распачата летась, — адзначыў кіраўнік ДКСЭ. — Мы не толькі закупілі дзясяткі комплексаў найноўшага абсталявання, але і падрыхтавалі людзей, у тым ліку і за мяжой. І гэта дало велізарны плён. Напрыклад, апрацоўка слядоў пальцаў рук і далоняў цяпер будзе займаць менш за 20 хвілін. Акрамя таго, наш спецыяліст можа на месцы атрымаць інфармацыю пра тое, каму менавіта належыць адбітак. Нямногія краіны валодаюць комплексамі падобнага кшталту. Даставернасць і эфектыўнасць іх работы вельмі высокая. І гэта яшчэ не ўсё — мы дааснасцілі нашы лабараторыі мабільнымі комплексамі, якія за лічаныя хвіліны дазваляюць вызначыць сапраўднасць дакументаў, грошай.

СТАР. 4

Ці чулі?

# ПУРПУРНЫ, СІНІ, ЛІЛОВЫ...

### Святлана Воцінава гамеапатычным метадам раскрывае тып Элізы Ажэшкі

**Галоўны рэдактар часопіса «Маладосць», пісьменніца і даследчыца Святлана Воцінава паспрабавала зрабіць свайго роду сенсацыю ў беларускай культурнай прасторы! Яна вырашыла скарыстацца гамеапатычным метадам, для таго каб даведацца пра некаторыя асабістыя характарыстыкі, схільнасці, густы вядомай гродзенскай пісьменніцы Элізы Ажэшкі. Дарэчы, і сама Святлана Воцінава з Гродна — можа, таму такая цікавасць да зямлячкі?.. Наколькі ўдалым атрымаўся такі смелы эксперымент, маркуйце самі — падрабязнасці ў гутарцы з даследчыцай.**




СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на ІІІ квартал і ІІ паўгоддзе

Мы абяцаем цікавае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – НЕ ПАШКАДУЕЦЕ!